*Свіслацкая цэнтральная раённая бібліятэка*
*Аддзел абслугоўвання і інфармацыі*





# Помнікі прыроды Свіслацкага раёна



*Свіслач 2014г.*

Наш прыбелавежскі край, Свіслацкі раён, – адзін з цудоўнейшых куточкаў зямлі беларускай, прыгожы, маляўнічы.

Свіслацкі раён размешчаны на паўднёвым захадзе Гродзенскай вобласці. Плошча 1446 квадратных кіламетраў. З поўначы на поўдзень раён працягнуўся на 40км, а з захаду на ўсход – амаль на 50км. Даўжыня мяжы вакол раёна больш як 200км.

Калі ад Свіслачы накіравацца на паўднёвы ўсход раёна і праехаць па дарозе, што праходзіць між пералескаў, азёр, рачулак і наблізіцца да ваколіц Поразава, дык убачым цудоўныя па прыгажосці краявіды. Тут і стромкія пагоркі Ваўкавыскага узвышша, што ўразаюцца ў наш раён. Яны ўздымаюцца хваля за хваляй і спалучаюцца ў адну плаўную лінію. Каля вёскі Гарнастаевічы ўзгоркі пакрыты лесам, а сярод іх у нізіне працякае рака Рось, прыток Нёмана.

На паўночным усходзе раёна знаходзіцца Ваўкавыскае ўзвышша, найвышэйшы пункт якога – 242 метры над узроўнем мора (5км на захад ад Поразава). Значная частка паверхні раёна гарыстая. Большасць яе прыходзіцца на Нараўска-Ясельдскую раўніну, якая ўваходзіць у Прыбугскую. Самая нізкая адзнака ў раёне – 139 метраў над узроўнем мора.

Уражваюць чысцінёй вады і незвычайным халадком у летнюю спякоту **возера за вёскай Раманаўцы** і **возера ў вёсцы Стокі**. Хваёвыя лясы, якія акружаюць вадаём, напамінаюць нам аб тым, што пушча ўжо зусім блізка.





## *Штучныя вадасховішчы.*

У Свіслацкім раёне пабудаваны штучныя (рукатворныя) вадасховішчы. Буйнейшае з іх Корнадзьскае (каля вёскі Корнадзь). Яно наліўное, створана ў 1978 годзе. Плошча 3,18 квадратнага кіламетра, даўжыня – 2,5км, шырыня да 1,5км, глыбіня да 3,8 метра, сярэдняя глыбіня – 1,95м. Напаўняецца помпамі з ракі Ясельда па падземнаму каналу. Выкарыстоўваецца для рэгулявання воднага рэжыму сельскагаспадарчых земляў, развядзення рыбы. Яно размешчана недалёка ад гідралагічнага заказніка “Дзікае”.

Другім па велічыні вадасховішчам з’яўляецца Лубянскае, што на рацэ Лубянка. Створана ў 1978 годзе. Плошча – 0,74 квадратнага кіламетра, даўжыня – 1,25км, шырыня – да 2км, глыбіня – да 2,9м. Выкарыстоўваецца для рэгулявання воднага рэжыму і развядзення рыбы.

У 60-я гады штучнае возера створана на рацэ Свіслач у райцэнтры.

## *Рэкі.*

Самая вялікая рака, што бярэ пачатак у Свіслацкім раёне – гэта Нараў, яна ўпадае ў Віслу. Даўжыня яе 490км (у Беларусі 42км). Асноўныя прытокі ракі ў раёне: Рудаўка – правы прыток, Калонка, Тушамлянка, Нараўка, Мядзянка.



Свіслач, левы прыток Нёмана, пачынаецца на паўднёва-заходніх схілах Ваўкавыскага ўзвышша ля Занак з невялікай крынічкі. Ад гэтай вёскі невялікім ручаём цячэ праз урочышча Кавалеўшчыны, затым каля Грыцок праз урочышча Крывое балота. Даўжыня ракі 121км. Прытокі на тэрыторыі раёна: Рудаўка – правы і Істачанка – левы. Даліна ў верхнім і ніжнім цячэнні ясна выражана. Шырыня 0,8-2 кіламетры. Пойма двухбаковая, шырыня 300-500 метраў. Русла ў верхнім цячэннях каналізавана, шырыня яго 3-6 метраў. На астатнім цячэнні яно звілістае, шырыня 10-35 метраў. Берагі ўмерана крутыя, у ніжнім цячэнні абрывістыя. За горадам Свіслач рака працякае каля вёсак Ранявічы, Пацуі, Ганчары, Дварчаны, Яскулды, Чаплічы, Грыцавічы, Клепачы, Краснае, Каласы… Свіслач – рака несуднаходная, але яшчэ ў мінулым стагоддзі па ёй сплаўлялі невялікія платы, пачынаючы ад мястэчка Свіслач. Вадзяныя млыны і плаціны былі ў Свіслачы, Пацуях, Грыцавічах, Краснай, Бурстаўшчыне, Мастаўлянах, Баброўніках, Галынцы, Ярмолічах, Вайтаўшчыне, Карозічах.

Рось, левы прыток Нёмана, бярэ пачатак каля вёскі Дзешкаўцы-Груд, даўжыня яе 99км. Правы прыток Росі – Харужаўка, даўжыня якога 24км. У ніжнім цячэнні каналізаваны. Водазбор 162 квадратныя кіламетры. Левы прыток – Свянціца. Даўжыня яго 10км, вадазбор 38 квадратных кіламетраў. Даліна Росі мае шырыню 1-2,5км. Русла ў вярхоўі каналізавана, ніжэй звілістае, берагі крутыя, абрывістыя.

Рака Зяльвянка – левы прыток Нёмана, пачынаецца на тэрыторыі Свіслацкага раёна паміж вёскамі Лідзяны і Кулявічы.

Даўжыня яе 170км. Працякае ў асноўным праз Ваўкавыскі, Пружанскі, Зэльвенскі і Мастоўскі раёны.

Рака Калонка, правы прыток Нарава, пачынаецца ля вёскі Сакольнікі. Даўжыня 34км (у Беларусі 29км). Русла каналізавана, вадазбор 247 квадратных кіламетраў. Найбольшы прыток (левы) – рэчка Крапіўніца, якая пачынаецца каля аднайменнай вёскі. Даўжыня гэтага прытоку 10км. Русла каналізавана, вадазбор 29 квадратных кіламетраў. Правыя прыткі – Яцвезь і Бярозаўка.

Праз Свіслацкі раён праходзіць вадападзел басейнаў Нёмана, Нарава і Прыпяці паміж Балтыйскім і Чорным марамі.

## *Ручаі.*

На Свіслацкай зямлі шмат малых рачулак і ручаёў. Яны цікавыя сваімі назвамі і ўзбагачаюць тапаніміку нашага краю. Вось, напрыклад, Альшанка (Вердамічы), Брод (Ханчыцы), Бярозаўка (Нязбодзічы), Выднарка (Зарэчаны), Крапіўнічанка (Крапіўніца), Мацелькаўшчызна (Стокі), Мядзянка (Новы Двор), Немяржанка (Нямержа), Істачанка (Стокі першыя), Лапа (Міхайлы), Свінка (Палонка), Свінарэйка (Вялікае Сяло), Рудаўка (Рудаўка), Рудніца (Рудня), Перадзелка (Грынкі), Цымба (Рудня), Шнычуга (Дзямідава), Ятвезь (Ятвеск), Тушамлянка (Тушамля).

## *Лясы.*

Лес у раёне займае 49% яго тэрыторыі. Пераважна ён размяшчаецца на паўднёвым захадзе, дзе знаходзіцца частка **Белавежскай** (раней Свіслацкай) **пушчы**. Пушча ў раёне займае 38,8 тыс.гектараў. У ёй налічваюцца 844 віды вышэйшых раслін, 220 відаў мохападобных, каля 260 відаў лішайнікаў, 150 відаў трутавых грыбоў.

Асноўныя пароды дрэў – сасна, ёлка, вольха, бяроза, дуб, ёсць 58 відаў хмызнякоў і кустоўя. Выдзяляюцца 12 тыпаў лесу. Пераважаюць бары (каля 60% плошчы), пераважна мохавыя. Расце 26 відаў дрэў. Лясы належаць да старэйшых у Еўропе. Узровень бароў дасягае 180-200 год, ельніку 120-160, дуброў 180-220 год. Але ёсць экзэмпляры дубоў, узрост якіх дасягае некалькі стагоддзяў. Такім з’яўляецца “цар-дуб”, што ў ваколіцах вёсак Рудня і Жаркаўшчына. Яго ўзрост ацэньваецца ў 700 год, вышыня – 41 метр, дыяметр – 2,4 метра, акружнасць – 640см.

Жывёльны свет (фаўну) прадстаўляюць 59 відаў млекакормячых, 226 відаў птушак, 11 земляводных, 7 паўзуноў, каля 30 відаў рыб, 8,5 тысяч відаў насякомых. Патрыярхам і гонарам пушчы лічыцца белавежскі зубр. Водзяцца высакародны алень, лось, касуля, дзікія свінні. Калісьці ў лясах Свіслаччыны жылі паўночныя алені, мускатныя быкі, пячорныя мядзведзі, туры, расамахі. Але за апошнія 400 год загінула ў асноўным па віне чалавека 130 млекакормячых і птушак. У 1627 годзе быў забіты апошні тур, у 1878 годзе – мядзведзь, у канцы 18 веку зніклі тарпаны, лані. У пачатку 19 вывеліся бабры. 19 лютага 1919 года браканьерам забіты апошні зубр. У Чырвоную кнігу занесены 6 звяроў і птушак, а таксама 22 расліны нашага раёна.



Кожны турыст, аматар прыроды ці навуковец, сутыкнуўшыся з пушчай, застаецца пад моцным уражаннем агромістай дзікай першабытнай прыроды, якая захавалася ў шматлікіх фрагментах лясоў з жывым патрыярхам старажытных жывёл – зубрам.

### ***Балоты.***

На тэрыторыі Свіслацкага раёна часткова размешчана нізіннае балота “Дзікае” у вадазборах рэк Ясельды і Нарава. Плошча 21,7 тысяч гектараў. Гэты велізарны балотны масіў – равеснік егіпецкіх пірамід, узрост якога налічвае болей за шэсць тысяч гадоў. “Дзікае” па-сапраўднаму стала тым Ноевым каўчэгам, у якім удалося захавацца рэдкім відам еўрапейскай флоры і фаўны. Гэта балота насяляюць 14 відаў птушак, 2 віда млекакормячых, 13 відаў насякомых і 14 відаў раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Усяго ж тут расце 680 відаў раслін, жыве 28 відаў млекакормячых, 99 відаў птушак, 4 – рэптылій і 5 – амфібій. У 2001 годзе балота “Дзікае” увайшло ў склад Белавежскай пушчы. “Дзікае” – гонар нашага раёна і той бясцэнны дар, які дала нам прырода.



У межах раёна часткова размешчана Хароўскае балота, якое знаходзіцца ў вадазборы ракі Ясельды. Плошча ўсяго гэтага

нізіннага балота 7,4 тысяч гектараў. Прамысловыя залежы торфу – на 6 тысяч гектараў на глыбіні 1,7 метра. Ёсць маргель таўшчынёй да 1,6 метра, сапрапель – да 0,6 метра. Паўночная частка асушваецца і выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць.

## *Паркі.*

У раёне захаваліся два помнікі флоры, створаныя нашымі продкамі. Гэта Вердаміцкі і Свіслацкі паркі.



Вердаміцкі парк з'яўляецца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Знаходзіцца ён у былой сядзібе графаў Талочкаў ля вёскі Вердамічы. Заснаваны ўладальнікам Вердаміч, адным з Талочкаў у другой палове 19 стагоддзя. Двенаццацігектарны парк пейзажны, размешчаны на раўнінным рэльефе. Ад уяздной брамы ў цэнтр ідуць кальцавыя алеі, з якіх адкрываюцца прыгожыя пейзажы. Па абодвух баках цэнтральнай алеі дзве вялікія маляўнічыя паляны. У кампазіцыі выкарыстаны прыёмы паступовага раскрыцця пейзажу і кантрасту. Улічаны асаблівасці дрэў (афарбоўка ў розныя поры года), форма кароны, хуткасць росту. Налічваюцца больш 40 відаў дрэў і кустоўя, у тым ліку рэдкія экзоты: дуб шарлахоўскі, клён чырвоны і срабрысты, ясень ліставы, явар і яго пурпурналісцевая форма, сасна веймутава, лістоўніца еўрапейская і польская, туя заходняя. У 1999 годзе сіламі саўгаса пачаліся добраўпарадкаванне і рэканструкцыя парка і яго вадаёмаў.



Свіслацкі парк – помнік садова-паркавага мастацтва на паўднёва-заходняй ускраіне райцэнтра на левым беразе ракі Свіслач. Закладзены ў другой палове 18 стагоддзя як прысядзібны ўладальнікам Свіслачы Вінцэнтам Тышкевічам. Адзіны ансамбль з паркам стварылі палац, аранжэрэя, мураваная агароджа з брамамі і альтанкамі. Участак парку плошчай у шэсць гектараў вакол прамавугольных вадаёмаў, на берагах якіх захавалася некалькі паркавых пасадак. Прамавугольны, мае рэгулярную планіроўку і разбіты на тэрасы. Асноўныя маршруты праходзяць па кляновых алеях, што акаймляюць парк па перыметру. Уязная яловая алея

заканчваецца паўкруглым газонам, які размяшчаўся перад палацам. Пераважаюць граб і вольха. Захаваліся вадаёмы, ліпавыя алеі, а таксама сляды невялікіх тэрас з нязначнымі перападамі.

Пазней, пасля смерці Вінцэнта, тутэйшым уладальнікам стаў Тадэвуш Тышкевіч. Ён загадаў пасадзіць экзоты: піхту бальзамалісцевую і сібірскую, лістоўніцу амерыканскую (цяпер вышыня 25 метраў, дыяметр 60 сантыметраў), еўрапейскую, сібірскую і курыльскую, арэх маньчжурскі, шаўкавіцу белую.

У 1998-2000 гадах праведзены кардынальная рэканструкцыя і аднаўленне гэтага цудоўнага куточка Свіслачы. Алеі ачышчаны ад старых дрэў, пасаджана многа маладых, і парк стаў значна большым па плошчы. Адноўлены вадаёмы. Яны паглыблены, ачышчаны, умацаваны пліткай берагі. На адным з вадаёмаў з'явіўся ажурны, як бы вісячы, мост. Упарадкаваны стадыён. Парк абнесены дэкаратыўнай чыгуннай агароджай і прыгожай мураванай сцяной. Пабудаваны шыкоўныя брамы пры ўваходзе ў парк. Ён каштоўны не толькі сваім дэкаратыўным выглядам. Гэта месца масавых мерапрыемстваў, адпачынку жыхароў горада і гасцей.